Краснаслабодская гарпасялковая экалагічная бібліятэка
ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка"

# Мы гэтай памяці адданы

Краязнаўчая база дадзеных
аб ветэранах і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны



2025

Горкая памяць Вялікай Айчыннай вайны адклікаецца ў душы кожнага жыхара Беларусі. Усё менш застаецца яе непасрэдных удзельнікаў, якія абаранялі і перажылі гэта ліхалецце. У вёсках, раёнах, гарадах ёсць памятныя мясціны, звязаныя з трагічнымі і гераічнымі падзеямі тых гадоў. Многія з іх ужо даследаваны і апісаны. Але застаюцца яшчэ безназоўныя подзвігі, забытыя імёны і пропускі ў спісах. Краязнаўчая база дадзеных аб ветэранах і сведках Вялікай Айчыннай вайны гарадскога пасёлка Красная Слабада Салігорскага раёна «Мы гэтай памяці адданы» заклікае аднаўляць, вяртаць і захоўваць дакументальную памяць аб вайне, перадаючы яе новаму пакаленню.

Электронны прадукт стварыў калектыў Краснаслабодскай гарпасялковай экалагічнай бібліятэкі-філіяла №5 ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка». Супрацоўнікі на працягу дзесяці гадоў руплíва праводзілі працу па пошуку і захаванню памяці аб удзельніках вайны, якія з'яўляюцца жыхарамі населенага пункта. Пастаянна ажыццяўлялі збор друкаванай інфармацыі аб людзях у кнігах, газетах і часопісах. Бібліятэкары збіралі ў папкі-назапашвальнікі ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, размаўлялі з іх сваякамі, якія маглі ўзгадаць каштоўныя звесткі аб ветэранах і запісвалі расповяды відавочцаў, а потым стварылі электронны варыянт.




Спецыялісты зрабілі вялікую працу па аблічбоўцы і скáніраванні дакументаў ваенных часоў, узнагародных лістоў, франтавых пасведчанняў асоб, фатаграфій з асабістых архіваў ветэранаў і іншых каштоўных папер.

На аснове сабраных звестак была створана краязнаўчая база дадзеных.

Карыстальнікі знойдуць артыкулы з гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Салігорскі раён», перыядычных выданняў. Гэты раздзел папаўняецца новымі артыкуламі з грамадска-палітычнага выдання «Шахцёр» і газеты адкрытага акцыянернага таварыства «Калійшчык Салігорска». Бібліятэкары шукаюць і дадаюць звесткі з сучасных друкаваных выданняў, якімі папаўняецца фонд бібліятэкі.




Электронны рэсурс стварае для карыстальнікаў спрыяльныя ўмовы для карыстання бібліятэчнымі дакументамі.

Краязнаўчая база дадзеных «Мы гэтай памяці адданы» створана ў 2021 годзе на платформе Sites.google.com і размешчана на сайце https://rcb.solcult.by ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка». Значным дасягненнем з'яўляецца запатрабаванасць электроннага рэсурсу – больш за 20 000 наведванняў за час працы.

Краснаслабодская гарпасялковая экалагічная бібліятэка мае асабісты блог, дзе вылучана рубрыка «Памяць» (1941-1945), праз якую можна атрымаць доступ да электроннага прадукта. https://krasnoslobodskayalibrary.blogspot.com/p/1941-1945.html




База дадзеных «Мы гэтай памяці адданы» складаецца з 3 асноўных рубрык: «Салдаты Радзімы маёй», «Партызанскімі сцежкамі», «Дзеці героі і сведкі вайны», якія змяшчаюць біяграфічную, фактаграфічную, бібліяграфічную інфармацыю. Вельмі каштоўнымі з'яўляюцца старонкі ўспамінаў, дакументы з сямейных хронік. Даўнія падзеі набліжаюцца да нас, даючы магчымасць адчуць той час праз жывую памяць сэрца.

Рэсурс змяшчае звесткі аб 53 ветэранах і сведках Вялікай Айчыннай вайны, якія нарадзіліся і пражывалі ў гарадскім пасёлку. Спісы сфарміраваны ў алфавітным парадку, што робіць базу дадзеных зручнай у выкарыстанні.

На галоўнай старонцы складальнікі вызначылі мэту базы дадзеных – захаваць памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, папулярызаваць гераічную гісторыю Салігоршчыны, подзвіг землякоў, герояў, якія рызыкавалі жыццём, абараняючы Радзіму. Бібліятэкары падкрэслілі сваю асабістую працу і ўклад у захаванне краязнаўчых звестак і гістарычных фактаў. Аўтары выказалі падзяку жыхарам гарадскога пасёлка Красная Слабада, якія прадставілі звесткі пра сябе і сваіх блізкіх і запрасілі да ўдзелу ўсіх, хто можа дапоўніць інфармацыйны рэсурс.

На цяперашні час краязнаўчая база дадзеных складаецца з 74 бібліяграфічных запісаў і змяшчае 61 паўнатэкставы дакумент, а таксама спасылкі на электронныя рэсурсы. Пры наяўнасці ўзнагарод у ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны дадзены спасылкі на электронныя рэсурсы Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі: базу дадзеных «Память народа 1941-1945», абагульнены банк дадзеных узнагародных дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны «Подвиг народа 1941-1945». Удакладняючыя звесткі пра партызан дае спасылка на спецпраект Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Беларусі «Партизаны Беларуси».

Электронны фармат зрабіў гістарычна важную інфармацыю агульнадаступнай. Каштоўнасць базы дадзеных з часам толькі павялічваецца, бо змяшчае ўспаміны відавочцаў вайны, якіх на сённяшні дзень ужо няма побач з намі.




У рубрыцы «Салдаты Радзімы маёй» сабрана інфармацыя і фотаматэрыялы аб 30 франтавіках, жыццё якіх звязана з гарпасёлкам. Пра кожнага ветэрана дадзены біяграфічныя звесткі, або іх асабістыя расповяды, успаміны сваякоў, вытрымкі з газет. Унізе тэксту дадзены спасылкі на базу дадзеных «Память народа 1941-1945», абагульнены банк дадзеных узнагародных дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны «Подвиг народа 1941-1945». Гісторыя кожнага чалавека аздоблена фотаздымкамі і аблічбаванымі дакументамі.

Добрым прыкладам з'яўляецца старонка, прысвечаная Найману Рыгору Барысавічу. Бібліятэкары прадставілі біяграфію, дзе расказалі пра яго баявы шлях і працоўную дзейнасць, накіраваную на пасляваеннае аднаўленне гарпасёлка Красная Слабада. У форме відэаслайдаў карыстальнікам прадстаўлены ўзнагароды і ўзнагародныя лісты Рыгора Барысавіча, фотаздымкі, спасылкі на базы дадзеных, якія пацвярджаюць знакі пашаны.




Бібліятэкары пры стварэнні рэсурса размаўлялі са сваякамі франтавікоў, рупліва запісвалі ўспаміны, якія потым размясцілі на яго старонках у базе дадзеных. Напрыклад, расповед пра Главацкага Уладзіміра Ціханавіча дапоўнены словамі яго дачкі Святланы. Гэта каштоўныя звесткі пра пасляваеннае жыццё: «Тата любіў глядзець фільм Ю. Озерава «Вызваленне», чытаць кнігі В. Быкава, А. Ананьева, К. Сіманава». Падкрэслівала яна і стаўленне бацькі да Вялікай Перамогі і землякоў да сваіх герояў: «Кожны год, 9 мая, тата ўставаў раніцай, мыўся, начышчаў свае медалі і апранаўся. За ім прыязджала машына з іншымі ветэранамі і ўсе разам яны ехалі да помнікаў ускладаць кветкі і ўшаноўваць памяць загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне».




Такая інфармацыя набывае пэўную запатрабаванасць з цягам часу. Ужо сёння, праз дзесяцігоддзе пасля пачатку збору інфармацыі, амаль не засталося відавочцаў вогненных гадоў.




Рубрыка «Партызанскімі сцежкамі» змяшчае сведчанні 17 жыхароў гарпасёлка, якія ваявалі ў партызанскіх атрадах. Разам з дарослымі людзьмі было шмат падлеткаў, якіх вайна вырвала са звыклага жыцця. Яны былі вымушаны ратавацца, а потым змагацца супраць ворага. Пераадольваючы жах, выконвалі самыя адказныя заданні, у тым ліку і здабывалі разведдадзеныя, станавіліся сувязнымі.

Яскравым прыкладам адданасці сваёй Радзіме стала жыццё Брадзіхіна Віктара Якаўлевіча. У пятнаццаць гадоў ён стаў байцом партызанскага атрада «Беларусь». Віктару давялося ўдзельнічаць у многіх баявых аперацыях. Партызаны ўзрывалі чыгуначныя пуці, знішчалі нямецкія эшалоны. За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне баец-партызан быў узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй», ордэнам Айчыннай вайны II ступені.




Паказальны яго далейшы лёс. Пасля вайны Віктар Якаўлевіч пайшоў у школу міліцыі ў горадзе Каўнасе Літоўскай ССР і ў далейшым быў накіраваны на працу ў Красную Слабаду, дзе служыў участковым міліцыянерам. Бібліятэкары распавялі пра лёс чалавека, які з'яўляецца прыкладам для падрастаючага пакалення сваёй любоўю і служэннем Айчыне.

Цікавымі ў базе дадзеных з'яўляюцца гісторыі мужа і жонкі Дубровіных Віктара Фёдаравіча і Ніны Фёдараўны, якія ваявалі ў 12-й партызанскай брыгадзе імя Сталіна. Увазе карыстальнікаў прадстаўлены гісторыя партызанскай барацьбы маладых камуністаў, дакументы, ўзнагароды і, нават, урывак з кнігі С. Мальцава «Когда опасность рядом», якая яскрава перадае




падзеі ваенных гадоў, мужнасць савецкіх людзей. Карыстальнікі, якія зацікавяцца кнігай, маюць магчымасць атрымаць яе з фонда бібліятэкі. Трэба адзначыць, што каштоўнае выданне бібліятэкары атрымалі ў перыяд пошукавай працы. Падчас збора інфармацыі аб партызане Смірнове У.П., яны цесна кантактавалі з яго дачкой. Святлана Смірнова расказала аб сяброўстве сям'і з пісьменнікам Сяргеем Мальцавым і кнізе, якую ён падараваў яе бацьку. У падзяку аб праведзенай рабоце па захаванні памяці пра Уладзіміра Пятровіча жанчына перадала каштоўнае выданне ў дар бібліятэцы.




Бібліятэкары сабралі звесткі аб легендарных асобах. Партызан Канаплянік Аляксандр Мікалаевіч да вайны працаваў наборшчыкам у друкарні газеты «Калгаснік». Затым быў прызваны ў войска. На Фінскім фронце ваяваў, быў радыстам, а пасля дэмабілізацыі працаваў у Чырвонаслабодскай друкарні на пасадзе загадчыка.

У лістападзе 1942 года ён пайшоў у партызанскі атрад імя Суворава, дзе быў старшым наборшчыкам падпольнай друкарні газеты «Чырвоная Зара». Ім выпушчана 32 нумары газеты тыражом 11 700 экз. і лістовак 57 нумароў тыражом 15 780 экз. Газета адыграла вялікую ролю ў частцы ўзаемнага аб'яднання партызан з мясцовым насельніцтвам і не давала нямецкім уладам поўнасцю ажыццяўляць свае знішчальныя мерапрыемствы.

Вялікая Айчынная вайна пакінула беларускаму народу цяжкую спадчыну – памяць аб жудасных трагедыях людзей, якія сталі сведкамі і ахвярамі жахлівых злачынстваў фашызму.




Рубрыка «Дзеці героі і сведкі вайны» напоўнена трагічнымі ўспамінамі 13 жыхароў гарпасёлка пра акупацыйнае ліхалецце, час голаду і нягод. Іх дзяцінства прыйшлося на гады вайны і яна на ўсё жыццё пакінула ў душы незагойныя раны.

На старонцы Аляшкевіч Тамары Уладзіміраўны размешчаны ўспаміны аб падзеях 1941-1944 гадоў. Пасёлак быў акупаваны немцамі на пяты дзень вайны, таму ў памяць урэзаліся жахлівыя дні: маці з маленькімі дзецьмі бегла з дому і хавалася зімой у лесе; смяротная небяспека ад эпідэміі дызентэрыі, тыфу; карныя аперацыі фашыстаў. Жанчына стала сведкам страшнай расправы над яўрэйскімі сем'ямі, партызанамі і мясцовымі жыхарамі.




Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна Тамары Трафімаўне Кулік было 3 гады. Успаміны захавалі найбольш страшныя і яркія моманты. Напрыклад, жах, калі сям'ю вывелі на растрэл, паставілі пад аўтаматы нават маленькіх дзяцей. Гэты боль душы застанецца сведчаннем страшных вогненных гадоў для будучых пакаленняў.

Рэсурсаў па Вялікай Айчыннай вайне на прасторах інтэрнэту вельмі шмат. Сярод шырокай разнастайнасці матэрыялаў база дадзеных «Мы гэтай памяці аддадзены» ўяўляе інфармацыйную каштоўнасць для тых, хто не

абыякавы да гістарычных падзей гарадскога пасёлка Красная Слабада Салігорскога раёна, і, ў вогуле, нашай краіны. Бібліятэкары працягваюць працаваць над базай дадзеных, дапаўняюць яе паўнатэкставымі публікацыямі, бібліяграфічнымі запісамі.

Сабраныя звесткі выкарыстоўваюцца бібліятэкарамі пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, што дае магчымасць распаўсюджваць веды і папулярызаваць прадукт. Яны сталі рэсурсам, накіраваным на маральна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення і моладзі праз сумесныя віды дзейнасці бібліятэкараў, педагогаў, прадстаўнікоў грамадскіх і аматарскіх аб'яднанняў, удзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Бібліятэкары правялі больш за трыццаць мерапрыемстваў для ўсіх катэгорый карыстальнікаў.




У дзень Вялікай Перамогі на цэнтральнай плошчы пасёлка адбылося свята, у якім прынялі ўдзел бібліятэкары з тэматычнай пляцоўкай «Свет памяці, свет сэрца, свет душы». Жыхарам былі прапанаваны цікавыя лакацыі і кніжная выстава «Славім вялікі подзвіг». Дзеці размалёўвалі маляванку і фатаграфаваліся з салдацкімі рэчамі. Дарослыя цікавіліся базай дадзеных «Мы гэтай памяці аддадзены», доступ да якой можна было ажыццявіць праз QR-код. У сталых людзей рэсурс выклікаў успаміны аб мінулай вайне і героях-земляках, а на вачах з'яўляліся слёзы падзякі за захаваную памяць.




Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бібліятэка разгарнула на цэнтральнай плошчы Краснай Слабады інтэрактыўную пляцоўку «Пад мірным небам Беларусі». Лакацыя «Нашы героі-землякі» знаёміла з удзельнікамі мінулай вайны. На кніжнай выставе прадставілі інфармацыю аб базе дадзеных «Мы гэтай памяці аддадзены» і змясцілі QR-код, які даваў магчымасць з дапамогай мабільнага тэлефона пазнаёміцца з электронным рэсурсам.

Першага верасня для навучэнцаў школы бібліятэкары правялі ўрок міру «Квітней, мой край, пад небам жураўліным». Бібліятэкар разам з юнакамі і дзяўчатамі адзначала беларускія прамысловыя брэнды, спартыўныя




дасягненні, народныя святы і абрады. Распавялі пра ветэранаў і партызанаў-землякоў. Моладзі спадабаўся даступны электронны фармат і сучасная падача матэрыялу, да таго ж яны ўбачылі людзей, з якімі былі знаёмыя, а зараз яшчэ і даведаліся пра іх легендарнае мінулае. На прыканцы

мерапрыемства ўдзельнікі зрабілі выснову: нам, беларусам, сапраўды ёсць чым ганарыцца, і асабіста неабходна берагчы і захоўваць мір і спакой для будучых пакаленняў.

Да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа для юных карыстальнікаў бібліятэкары правялі ўрок мужнасці «Імёны іх Радзіма не забудзе». Супрацоўнік расказала дзецям аб электронным рэсурсе, які захоўвае звесткі аб краснаслабодцах, выяваўшых на фронце і ў партызанскіх атрадах.




Педагагічны калектыў ДУА «Краснаслабодская сярэдняя школа Салігорскага раёна» прымяняе электронны рэсурс пры правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на маральна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення.

Савет Салігорскай раённай арганізацыі ветэранаў звяртаецца да базы дадзеных падчас мемарыяльных мерапрыемстваў, якія аддаюць даніну павагі кожнаму, хто на палях бітваў і ў тыле ворага цаной уласнага жыцця набліжаў мір і з гонарам выканаў абавязак Салдата.

Краязнаўчая база дадзеных «Мы гэтай памяці аддany» з'яўляецца бясценным укладам у правядзенні мемарыяльных мерапрыемстваў, звязаных з увекавечваннем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»
Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы